НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Зразумела, апавяданне Навума Гальпяровіча, у тым ліку пра ўрокі англійскай мовы, якія знітоўваюць розныя перыяды жыцця лірычнага героя, і пра падлеткавае каханне, што, верагодна, павінна зацікавіць юнага чытача. Але разам з тым яно закранае вельмі важныя пытанні нашай камунікатыўнасці, калі ўнутраныя перакананні і суб'ектыўныя ацэнкі чалавека, надзеленага правам прымаць рашэнні ў дачыненні да іншых людзей, можа не лепшым чынам адбіцца на іх лёсе і крута памяняць яго. А гэта ўжо тэма, да якой неабыякавыя чытачы самых розных узроставых катэгорый.**

**Алесь БАДАК.**

**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ**

# УРОКІ АНГЛІЙСКАЙ

Выкладчыца нашых курсаў, высокая, крыху паўнаватая, прывабная такой спелай жаночай прыгажосцю, якая бывае ў кабет у трыццацьтрыццаць пяць гадоў, з цікавасцю паглядзела на мяне, бо сярод тых, хто здаваў экзамен за поўны цыкл навучання, я быў самы старэйшы. У нашай групе былі нават школьнікі-старшакласнікі, якія рыхтаваліся паступаць у лінгвістычны ўніверсітэт, маладыя бізнесмены, дзяўчаты, якія марылі пра замежныя падарожжы...

І толькі я, лысаваты і сівы, вылучаўся сваім знешнім выглядам, і калі наша куратарша на пачатку трохгадовых заняткаў пыталася ў кожнага, якая галоўная мэта прывяла вывучаць англійскую мову, я грубавата пажартаваў, што для мяне гэта — прафілактыка старэчага маразму, чым выклікаў вясёлую рэакцыю ў аўдыторыі. І вось цяпер настаў той момант, калі трэба было паказаць, як я засвоіў прадмет за час навучання.

— English is my early dream (англійская мова — мая даўняя мара), — пачаў я адказ, і ў вачах настаўніцы засвяцілася цікавасць. Я коратка, як змог, расказаў, што захапіўся англійскай яшчэ ў школе, нават паступаў першы год у інстытут замежных моў, але потым жыццё павярнула мяне на іншыя шляхі, і дзіцячая мара так і не спраўдзілася.

— Што ж, лепш позна, чым ніколі, — сказала мне на развітанне выкладчыца, паставіўшы «выдатна».

Ідучы дадому з атрыманым сертыфікатам, я ўзгадваў сваё полацкае дзяцінства і юнацтва, і тую цікавасць да незнаёмых слоў і выразаў, якая прыйшла да мяне літаральна з першых урокаў яшчэ ў пятым класе.

Але па-сапраўднаму далучацца да мовы я пачаў ужо ў восьмым класе, калі да нас прыйшла новая настаўніца Нэлі Іванаўна. Яна, відаць, нядаўна скончыла інстытут, маладая, танклявая, з белакурымі валасамі, і позіркі аднакласнікаў міжволі слізгалі на яе стромкую постаць, на прыгожыя загарэлыя ногі, якія адкрывала кароткая сукенка.

І голас у яе быў прыемны — нізкаваты, з ледзь улоўнай хрыпкай. Англійская мова ў яе вуснах гучала па-чароўнаму мілагучна, амаль так вабна, як у славутых «Бітлоў» — куміраў многіх маіх сучаснікаў.

Новая настаўніца адразу вылучыла мяне сярод аднакласнікаў, бо, шчыра кажучы, акрамя, бадай, мяне ніхто ў нашым класе да замежнай мовы сур'ёзна не ставіўся, зрэшты, як і былая выкладчыца Ала Пятроўна. А я спрабаваў нават самастойна чытаць па-англійску адаптаваныя дзіцячыя кніжкі, якія можна было набыць у нашай гарадской кнігарні.

Аднойчы новая настаўніца папрасіла мяне застацца пасля ўрока.

— Ты, я бачу, у многім апярэджваеш аднакласнікаў, — загаварыла яна. — Табе падабаецца англійская мова?

— Так, — адказаў, чамусьці чырванеючы, я. — Падабаецца.

— Тады з тваёй згоды мы будзем займацца па асобнай праграме. Ты хочаш паступіць у інстытут замежных моў?

Для мяне гэтыя яе словы прагучалі як чароўная музыка. Пра рэпетытарства тады ў нашым прыгарадзе яшчэ ніхто не ведаў, і дадатковыя заняткі з любімымі вучнямі выкладчыкі арганізоўвалі абсалютна бясплатна. Вышэйшай узнагародай для іх лічылася, калі іх гадаванцы паступалі ў ВНУ. Пакольні такіх у наш час, прынамсі ў нашай школе, было не надта многа, гэта служыла важкім доказам іх прафесійнага майстэрства.

Так вось і пачаліся нашы заняткі. Нэлі Іванаўна прыносіла мне незнаёмыя тэксты, часам нават давала выконваць заданні для студэнтаў-завочнікаў, я таксама дапамагаў ёй правяраць хатнія заданні вучняў. Займаліся мы звычайна ў класе пасля ўрокаў, балазе англійская была па раскладзе апошняй гадзінай. Але ў дзявятым класе ўрок перанеслі, і заставацца ў школе стала нязручна.

— Можна займацца ў мяне дома, — сказала мне неяк Нэлі Іванаўна. — Недзе гадзін у дванаццаць, у нядзелю. — Згодны?

Як мне было не згадзіцца? Пра такое я нават і марыць не смеў. Увогуле, у прысутнасці настаўніцы часта адчуваў нейкае дзіўнае хваляванне, лавіў сябе на тым, што міжволі адводжу погляд ад яе блакітных вялікіх вачэй, прыгожай сукенкі, ноздры салодка казыча пах яе парфумы.

Нэлі Іванаўна жыла ў цэнтры горада ў невялікім двухпавярховым доме яшчэ даваеннай пабудовы. Яна, відаць, здымала пакой у трохпакаёвай кватэры сталінскага тыпу, з высокай столлю, зашклёнымі дзвярамі з масіўнымі ручкамі.

На першыя заняткі я ішоў як на свята. Апрануў найлепшую кашулю, доўга змочваў вадой непаслухмяныя кудзеры, нават пашкроб бацькавым лязом вусікі, што праступалі над верхняй губой.

Гэтыя нашы спатканні былі самымі шчаслівымі гадзінамі ў маім жыцці. Увесь тыдзень я з нецярпеннем чакаў нядзелі, уяўляючы, як я, седзячы насупраць настаўніцы, буду прамаўляць вывучаную вусную тэму, бачыць яе прыгожы ветлы твар, чуць яе хрыплаваты голас...

Прайшоў год. У выпускным класе раптам мой аднакласнік, прыгажун і спартсмен Андрэй папрасіўся займацца разам са мной. Мову ён ведаў слаба, больш налягаў на дакладныя прадметы і фізкультуру, таму яго жаданне выглядала крыху дзіўнавата. Не ведаю, ці здагадваўся ён пра мае дадатковыя заняткі з настаўніцай, але тое, што Нэлі Іванаўну ён вылучаў сярод іншых «вучылак», было відавочна.

Я, зразумела, не мог асмеліцца папрасіць настаўніцу ўзяць яшчэ аднаго вучня, таму веды, атрыманыя ад дадатковых заняткаў, пераносіў на вучобу з Андрэем. Такім чынам, англійскай мовы ў маім паўсядзённым раскладзе стала ўдвая болей.

Сябрук на дзіва хутка асвоіўся і паказваў нават несумненныя поспехі. Ва ўсякім разе, «траяк» у першай чвэрці паспяхова замяніў на «чацвёрку», а ў трэцяй Нэлі Іванаўна гучна абвясціла, што мой таварыш смела можа прэтэндаваць на «пяцёрку» за год.

— Твая заслуга? — спытала потым яна. — Што ж, можа, будзе табе кампаньён, хаця, вядома, база ў яго пакуль слабаватая для паступлення.



Мне сапраўды было прыемна, што ў сваім захапленні я стаў не адзінокі. Мы з Андрэем нават сталі размаўляць па-англійску між сабой. Прыемна было лавіць зацікаўленыя позіркі тых, хто раптам чуў, як мы «спікалі» ў самых людных месцах.

Аднойчы трапілі на апошні сеанс у кінатэатр. Яшчэ не пагасла святло ў глядзельнай зале і людзі ўсаджваліся на свае месцы. І раптам Валодзя на ўсю залу гучна вымавіў: «look around!» (паглядзі вакол!), а потым, калі я здзіўлена лыпнуў вачамі, удакладніў «look bask!» (азірніся!).

Я азірнуўся і ўбачыў нашу Нэлі Іванаўну з нейкім маладым чалавекам. Ён нешта ёй расказваў, а яна ўсміхалася ў адказ. Падалося, што, злавіўшы мой позірк, настаўніца раптам пачырванела. Стала прыкра і сорамна — ці ад таго, што ўбачыў, ці ад Андрэевых слоў, якія гучна азваліся ў зале.

Чакаў назаўтра, што настаўніца зробіць заўвагу, але яна прамаўчала.

Англійскую на атэстат сталасці мы абодва здалі на «выдатна». Асабліва камісіі спадабаўся мой адказ. Нэлі Іванаўна цвіла ад задавальнення, тым больш што дырэктрыса школы сказала, што мною можна ганарыцца, і яна, як і ўвесь педагагічны калектыў, не сумняваецца ў маёй бліскучай будучыні.

Рэальнасць жа аказалася зусім не такой. У Мінск мы паехалі з мамай, каб я мог падрыхтавацца да экзаменаў крыху раней. У яе там быў знаёмы па сумеснай рабоце ў саўгасе, які пераехаў у сталіцу: ён з'язджаў з сям'ёй на адпачынак і дазволіў мне пажыць, пакуль дадуць, як абітурыенту, інтэрнат, у сваёй кватэры, дзе заставалася яго маці — вясковая старая, якая пераехала жыць да сына.

Памятаю, як праводзіў маму з Мінска на вакзале. Я лічыў сябе ўжо дарослым, але тут раптам сэрца сціснула і на вачах навярнуліся слёзы. Мама стаяла такая маленькая, худзенькая, такая родная і мілая, а я заставаўся адзін, без яе, у чужым незнаёмым горадзе...

Яна таксама відавочна хвалявалася і ўсё казала:

— Ты ж, сынок, глядзі, займайся, позна не хадзі, слухайся бабулю...

Мне раптам захацелася дадому, як у дзяцінстве, калі я збег з піянерскага лагера літаральна праз тыдзень у сваю родную хату, пакінуўшы ў тумбачцы ля ложка ўсе свае рэчы, па якія потым бацька спецыяльна мусіў ездзіць, каб забраць і павініцца за такога «хатняга сыночка».

Але доўга пажыць мне ў маміных знаёмых не выпала, бо праз два дні ў Мінск прыехаў Андрэй. Жыць яму таксама не было дзе, і я прывёў яго на сваю часовую кватэру.

Старая выклікала мяне на кухню і, строга падціснуўшы вусны, сказала:

— Каго гэта ты прывёў? Арыштанта нейкага.

Андрэй сапраўды быў пастрыжаны «пад качан».

— Гэта мой сябар, аднакласнік, разам будзем паступаць у інстытут.

— Ніякіх такіх сяброў! Бач, да чаго дадумаўся! Дамаўляліся толькі пра цябе, — адрэзала старая.

Пакінуць аднаго сябра я не мог, і, сабраўшы чамадан, разам з ім выправіўся на вакзал, дзе мы пераначавалі і пайшлі шукаць сабе нейкае жытло.

Цэлы тыдзень да экзаменаў мы жылі ў бараку на ўскраіне горада, дзе разам з намі ў адным пакойчыку месціліся сама гаспадыня, яшчэ адзін хлопец-абітурыент і пляменніца гаспадыні, жанчына гадоў трыццаці, якая прыехала з вёскі шукаць у Мінску работу.

Але наступіла пара ўступных экзаменаў, нас пасялілі ў «ін'язаўскі» інтэрнат, і мы аджылі і павесялелі.

Тым больш што па сачыненні, якое было першым іспытам, я атрымаў «пяцёрку», а мой сябрук — «чацвёрку».

— Ну што, — казаў Андрэй, — цяпер ужо будзе лягчэй. Англійскую ўжо ты не баішся!

Я сапраўды прадчуваў добры вынік, бо па папярэдніх размовах з хлопцамі, што жылі разам з намі ў пакоі, адчуваў, што мову ведаю лепш, чым яны.

Мы з Андрэем апынуліся чамусьці ў розных групах, хоць прозвішчы нашы былі з ім на адну літару.

Такім чынам, я здаваў на дзень раней.

Бяды не прадказвала нічога. Білет аказаўся даволі лёгкі, вусную тэму я добра ведаў, з граматыкай справіўся хутка.

Але экзаменатары, а гэта былі суровага выгляду мужчына і паўнаватая кабета з вялікім шыньёнам на галаве, на дзіва не спяшаліся мяне адпускаць.

— Вось тут у вас была не вельмі выразная артыкуляцыя, — украдліва прабуркавала кабета, — каб паставіць «выдатна», давядзецца яшчэ задаць пару дадатковых пытанняў. Вы не супраць?

— Я гатовы, — паспешліва адказаў я.

Пытанняў аказалася далёка не пара. Я, узмакрэлы ад хвалявання, ледзь паспяваў адказваць, калі ў аўдыторыю зайшоў высокі, дагледжаны мужчына — як аказалася, сам рэктар.

Паслухаўшы крыху, ён холадна паглядзеў на мяне і раптам сказаў:

— Што вы катуеце чалавека? Думаю, свае тры балы ён цалкам заслужыў.

І пакуль выкладчыкі распісваліся ў экзаменацыйным лісце, паблажліва прамовіў:

— Ды і як у тым Полацку можна было падрыхтавацца? Там жа, відаць, нават курсаў няма. Пажывіце ў Мінску, пахадзіце на платныя курсы, і праз год прыходзьце.

Гэта быў прысуд. Андрэй, калі я яму ўсё расказаў, не мог паверыць.

— Калі ўжо ты «траяк» падчапіў, то што ўжо пра мяне казаць! Не пайду нават здаваць.

Але я яго ўгаварыў паспрабаваць.

— Ты ведаеш, — у захапленні расказваў потым мне сябрук, — я нават не ўсё ведаў, дык яны мне падказвалі, і вось — і ён паказаў мне ліст, дзе насупраць графы «англійская мова» акуратна было выпісана — «добра».

Дамоў мы вярталіся разам. Я, як той казаў «з гарбузом», ён — будучым студэнтам.

Праўда, правучыўся ён нядоўга. Спачатку нахапаў «хвастоў» за летнюю сесію, затым была нейкая бойка ў інтэрнаце, у якой ён прымаў удзел, і яго адлічылі.

А затым Андрэй увогуле з'ехаў некуды на Поўнач, і нашы жыццёвыя шляхі разышліся.

А я больш лёс не выпрабоўваў і мару стаць перакладчыкам закінуў назаўсёды. Хаця, шчыра кажучы, перадынстытуцкага запасу ведаў мне хапіла напоўніцу, каб лёгка атрымліваць найвышэйшыя ацэнкі па англійскай мове і ў інстытуце, куды я праз год паступіў, і ў аспірантуры.

І цяпер, праз шмат гадоў, пасля жаданага атрымання сертыфіката перакладчыка, я ўсё ж адчуваю, што лепш мову, чым тады, калі сямнаццацігадовым юнаком браў урокі ў незабыўнай Нэлі Іванаўны, я не ведаю, і таго высокага захаплення і радасці ад спазнання незнаёмай мне мовы не адчуваю.

Гэта як сустрэча з пастарэлым і даўно прайшоўшым першым каханнем.

А шкада.


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Солигорскторг» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:**

**ЛОТ № 1:** здание специализированное розничной торговли (магазин № 35) общей площадью 7 296,4 кв.м (инв. № 644/С-3766), включая многолетние насаждения (сосна 3 шт., живая изгородь (арония)), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 643000000001001064 площадью 1,2200 га (предоставлен в постоянное пользование), по адресу: Минская область, Солигорский район, ул. К. Заслонова, д. 63. Часть указанного недвижимого имущества сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

**Начальная цена с НДС – 39 893 203 296 бел. руб.** Стоимость снижена на 20%. Задаток 5% от начальной цены – **1 994 660 000** бел. руб.

**ЛОТ № 2:** одноэтажное кирпичное здание склада продовольственных товаров № 1, общ. пл. 1 604,9 кв.м (инв. № 644/С-34916), включая многолетние насаждения (береза, 5 шт.), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625000000012002429 площадью 0,5314 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий-1.

**Начальная цена с НДС – 3 415 883 400** бел. руб. Стоимость снижена на 10%. Задаток 10% от начальной цены – **341 588 000** бел. руб.

**ЛОТ № 3:** одноэтажное кирпичное здание мебельного склада, общ. пл. 972,9 кв.м (инв. № 644/С-34933), включая многолетние насаждения (береза, 2 шт.), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625000000012002430 площадью 0,3498 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий-1.

**Начальная цена с НДС – 1 630 578 600** бел. руб. Стоимость снижена на 10%. Задаток 10% от начальной цены – **163 057 000** бел. руб.

**ЛОТ № 4:** подъездной путь к железной дороге, протяженностью 405,7 м (инв. № 644/С-50473), год постройки 1979, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625000000012002783 площадью 0,5635 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий-1.

**Начальная цена с НДС – 290 019 960 бел. руб.** Стоимость снижена на 10%. Задаток 10% от начальной цены – **29 001 000** бел. руб.

**ЛОТ № 5:** здание склада № 6,9 общей площадью 1 724,9 кв.м (инв. № 644/С-2073), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625000000012002780 общей площадью 0,3752 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий-1.

**Начальная цена с НДС – 3 970 060 560 бел. руб**. Стоимость снижена на 10%. Задаток 10% от начальной цены – **397 006 000** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. **Возможно предоставление рассрочки оплаты** за объекты с внесением платежей в следующем порядке: 40 (сорок) процентов стоимости объекта оплатить в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи, оставшиеся 60 (шестьдесят) процентов стоимости объекта – в течение 3 (трех) календарных месяцев путем ежемесячного внесения платежей равными долями т.е. по 20 (двадцать) процентов от стоимости объекта ежемесячно. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by**.

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.09.2015.*

Аукцион состоится **30.10.2015** в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.10.2015** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**



МТБанк
Банк свежих решений

Наименование банка:

**ЗАО «МТБанк», г. Минск**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2015 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | П-т поясн. записки | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 326 083 | 234 479 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 541 723 | 297 921 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 910 305 | 316 474 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 360 468 | 704 059 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 3 664 751 | 2 951 284 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 8 676 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 244 | 244 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 194 263 | 131 575 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 16 397 | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 121 641 | 102 377 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 6 144 551 | 4 738 413 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 100 575 | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 690 428 | 687 913 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 4 305 969 | 3 201 456 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 267 061 | 215 579 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 62 410 | 53 480 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 5 426 443 | 4 158 428 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 121 857 | 121 857 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 64 530 | 53 494 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 31 784 | 25 680 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 499 937 | 378 954 |
| 30 | Всего собственный капитал | 121 | | 718 108 | 579 985 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 6 144 551 | 4 738 413 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 3 квартал 2015 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | П-т поясн. записки | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 797 625 | 765 749 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 495 098 | 486 364 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 302 527 | 279 385 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 432 532 | 327 159 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 59 209 | 41 274 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 373 323 | 285 885 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 10 290 | 9 008 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 147 878 | 45 942 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 11 317 | (165) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 405 227 | 201 491 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 111 377 | 38 446 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 425 328 | 286 907 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 21 945 | 18 105 |
| 15 | Прибыль(убыток) до налогообложения | 211 | | 104 212 | 151 998 |
| 16 | Расход(доход) по налогу на прибыль | 212 | | 15 966 | 19 815 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ(УБЫТОК) | 2 | | 88 246 | 132 183 |

Руководитель А.К. Жишкевич

И.о. главного бухгалтера Л.К. Левкович

Дата подписания 07 октября 2015

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 13, выдана Национальным банком Республики Беларусь 6 мая 2013 года.
УНП 100394906



## Извещение об открытом аукционе по продаже права аренды земельных участков в городе Гродно 13 ноября 2015 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.) | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | ул. Домбровского | 0,9678 | 440100000002008371 | 1 295 540 400 | 120 000 000 | 30 571 671 | Строительство объекта производственного назначения |
| 2. | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | Микрорайон «Южный-2» («Ольшанка-2»), позиция по генплану № 106 | 0,9185 | 440100000001008714 | 1 549 939 209 | 150 000 000 | 31 570 683 | Строительство продовольственного магазина, объекта бытового обслуживания со встроенными помещениями социально-гарантированного обслуживания |
| 3. | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | ул. О. Соломовой | 0,3739 | 440100000001008754 | 609 104 288 | 60 000 000 | 33 291 439 | Строительство контейнерной автомойки на 6 легковых автомобилей |

Победитель аукциона обязан:
- в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года;
- приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации;
- осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

**Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».**

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 152101752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** Доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: Паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона.

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 13 ноября 2015 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.**

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. № 57, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 15 октября по 9 ноября 2015 года**.

Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-05-46**.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

| Номер лота по порядку | Местоположение земельного участка | Начальная цена (руб.) | Размер задатка (руб.) | Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения | Условие проведение аукциона | Характеристика земельного участка | Кадастровый номер | Инженерная и транспортная инфраструктура | Дата проведения аукциона | Последний день приема заявлений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Бобруйский район, Сычковский сельисполком д. Щатково, пер. 3-й Масловского, 13 | 9 674 214 | 967 421 | 15 212 194 (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,1057 га | № 720884012601000220 | - | 16.11.2015 г. | 10.11.2015 г. до 17.00 |
| 2. | Бобруйский район, Сычковский сельисполком д. Щатково, пер. 3-й Масловского, 14 | 11 010 482 | 1 101 048 | 15 212 194 (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,1203 га | № 720884012601000221 | - | 30.11.2015 г. | 24.11.2015 г. до 17.00 |

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Аукцион состоится в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, каб. 61, в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-ого дня после публикации извещения в СМИ. Информация о земельных участках по контактному телефону в г. Бобруйске: 72-05-40, 71-74-30.

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в комиссию по проведению аукционов:
- заявление на участие в аукционе (с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка);
- заверенную копию платежного поручения о внесении задатка (10% от начальной цены) на расчетный счет Сычковского сельисполкома №3600712110013 в АСБ «Беларусбанк» филиал 703, код 760, УНН 700045734, код платежа 04901;
- представителем гражданина Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;
- при подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.

2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.

3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.

4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ СЫЧКОВСКОГО СЕЛЬСКОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА З.С. Трубочка